# ПАРАДАК — ПАКАЗЧЫК ДЫСЦЫПЛІНЫ І БЯСПЕКІ

## Прадпрыемствы нясуць сур'ёзную адказнасць за захаванасць сельгастэхнікі

**Аб гэтым Прэзідэнт заявіў учора, калі ў Палацы Незалежнасці абмяркоўваліся пытанні захоўвання і падрыхтоўкі сельскагаспадарчай тэхнікі да палявых работ, а таксама проціпажарная сітуацыя ў краіне на аб'ектах масавага наведвання грамадзян.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на дадзены момант інфармацыя, якая да яго даходзіць, сведчыць аб тым, што належная работа па забеспячэнні захаванасці і ўкамплектаванасці машынна-трактарнага парка да гэтага часу не наладжана.

«Калі б гэтую сельгастэхніку — трактары, аўтамабілі, прычапную тэхніку і іншую — куплялі калектыўныя прадпрыемствы і іншыя занятыя ў сельскай гаспадарцы за свой кроўны рубель, калі ласка — можаце мяне крытыкаваць, казаць, што гэта не мая справа і няма чаго ў гэта ўмешвацца, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але калі сельскагаспадарчыя прадпрыемствы ўсіх формаў уласнасці ідуць з працягнутай рукой у бюджэт, просяць субсідыі, датацыі, крэдыты, прытым крэдыты льготныя, і за кошт гэтага набываюць сельскагаспадарчую тэхніку і праводзяць іншыя мерапрыемствы ў сельскай гаспадарцы, тады будзьце ласкавы дастаць і пакласці на стол сваю актыўнасць па захаванасці гэтай тэхнікі».

Прэзідэнт нагадаў аб сваім даручэнні да 15 красавіка разабрацца з фактамі безгаспадарчасці самым жорсткім чынам, аж да завядзення крымінальных спраў: «Я хачу, каб не забывалі, што парадак на мехдвары — гэта паказчык жалезнай дысцыпліны, захавання тэхналогій, бяспекі работнікаў. А ў цэлым — гэта найважнейшы элемент эканомікі сяла».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў таксама ўвагу на проціпажарную сітуацыю, якая ў краіне складваецца не самым лепшым чынам. Толькі з пачатку года адбылося больш за 160 пажараў у ведамасным фондзе краіны, у жылым — 1600.

«Яшчэ раз паўтараю: не дай бог нам атрымаць нешта блізкае да Кемерава», — падкрэсліў беларускі лідар.

### Прычына — расхлябанасць і безгаспадарчасць

**Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА** адзначыў, што пажары ў жылым фондзе, на прадпрыемствах, у арганізацыях адбываюцца не з-за адсутнасці дарагіх інжынерна-тэхнічных рашэнняў, а з-за безадказнага стаўлення грамадзян да ўласнай бяспекі, невыканання кіраўнікамі прадпрыемстваў, службовымі асобамі сваіх абавязкаў па забеспячэнні здаровых і бяспечных умоў працы.

Уладзімір Вашчанка падкрэсліў, што да пажараў прыводзіць захламленасць тэрыторый смеццем, няправільная эксплуатацыя абсталявання, нясвоечасовая ачыстка працоўных месцаў ад гаручых матэрыялаў, курэнне ў неабсталяваных месцах, выкарыстанне адкрытага агню, невыкананне проціпажарных патрабаванняў пры правядзенні зварачных работ і эксплуатацыі электраабсталявання, наяўнасць крыніц узгарання. «Вялікі рэзерв мы бачым у навучанні і прывядзенні проціпажарных інструктажоў. Часта гэта робіцца фармальна. Работнікі прадпрыемстваў не валодаюць элементарнымі навыкамі дзеянняў у выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі», — сказаў Уладзімір Вашчанка.

Галоўная прычына такога становішча спраў — расхлябанасць і безгаспадарчасць. На сённяшні дзень вядзецца работа па ліквідацыі недахопаў, прыняты шэраг жорсткіх мер, падкрэсліў міністр па надзвычайных сітуацыях.

### Ад праверак — да ўздзеяння

Па выніках нарады **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ** падкрэсліў, што час угавораў і разваг пры праверцы сельскагаспадарчых прадпрыемстваў прайшоў, праваахоўнікі маюць намер прымяняць эфектыўныя меры ўздзеяння на гаспадаркі і арганізацыі.

«Калі казаць адкрыта, то пахваліцца няма чым ні нам з пункту гледжання праверкі, ні тым, каго мы правяралі, паколькі ў нейкай ступені парадак наведзены, але гэтага відавочна недастаткова для таго, каб сказаць, што ў нас усё ў парадку, усе шасцярэнькі круцяцца так, як трэба. Масла ў гэтыя шасцярэнькі мы падальём у найбліжэйшы час, і яны будуць круціцца — гэта дакладна», — сказаў міністр.

Па выніках нарады ён паведаміў журналістам, што кіраўнік дзяржавы паставіў канкрэтную задачу — перайсці ад курыравання некаторых пытанняў і праверачных мерапрыемстваў да эфектыўнага ўздзеяння на гэтыя працэсы з выкарыстаннем усіх прававых, адміністрацыйных, сілавых і іншых механізмаў, якія ёсць у распараджэнні Міністэрства ўнутраных спраў, Генеральнай пракуратуры, усяго сілавога блока.

Для ўздзеяння на негатыўныя працэсы будзе распрацавана сістэма мер. Міністр адзначыў, што праблема застарэлая, аднак механізм дакладна прымусіць працаваць больш эфектыўна. Якія парушэнні выяўлены ў сельгасарганізацыях? Асноўны пералік — гэта халатнасць, безадказнае стаўленне да матэрыяльна-тэхнічных сродкаў, загубленая тэхніка, парушэнне тэхналогій, а яшчэ гэта стаўленне да людзей, якія працуюць на зямлі.

### Часу мала, а працы шмат

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАЯЦ** пасля завяршэння нарады адзначыў, што сяўбу ранніх яравых збожжавых культур у краіне плануецца завяршыць да першага мая, усіх астатніх — не пазней за дзявятага мая. На яго думку, неабходна максімальна эфектыўна выкарыстоўваць кожны дзень для таго, каб забяспечыць тэхналагічную закладку ўраджаю.

Асобна стаіць пытанне захаванасці матэрыяльна-тэхнічнай уласнасці прадпрыемстваў, паколькі ў гэтым яшчэ трэба будзе навесці парадак. Леанід Заяц заявіў, што з абуральнымі фактамі безгаспадарчасці мірыцца ні ў якім разе нельга, трэба браца за ўсе хібы і недахопы, як, напрыклад, крадзеж паліва, бо іх ліквідацыя дасць нам эканомію матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў.

Таксама міністр расказаў, што ў 2018—2019 гадах істотны рост можа паказаць і жывёлагадоўля.

* * *

На сустрэчы беларускі лідар таксама выказаўся з нагоды 32-й гадавіны трагедыі на Чарнобыльскай АЭС. «Як звычайна, я сёння адлятаю на поўдзень краіны ў раёны, пацярпелыя ў выніку катастрофы, — адзначыў ён. — Перш за ўсё хачу паглядзець, як ідзе пасяўная кампанія і як выконваецца мае даручэнні па дадатковым уключэнні ў абарот сельскагаспадарчых зямель».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы папярэдзіў губернатараў і міністра сельскай гаспадаркі і харчавання, каб была паказана рэальная сітуацыя з выкананнем дадзеных даручэнняў.

Асобна кіраўнік дзяржавы адзначыў, што будаўніцтва новага моста цераз Прыпяць (ход якога ён можа наведаць — адпаведнае даручэнне дадзена) павінна быць завершана да сёмага лістапада. «Але папярэджваю: усе работы павінны быць закончаны ў гэтым годзе. Ніякіх работ на 2019 год, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

■ Каб помнілі

# МУЖНАСЦЬ У БРОНЗЕ

**Помнік энергетыкам Савецкага Саюза — ліквідатарам наступстваў аварыі на ЧАЭС адкрыты ў Хойніках**



Фота БелТА.

**На ім — тры спецыялісты, якія цягнуць кабель, каб падаць электрычнасць у абязточаныя раёны, якія накрыла радыеактыўнае воблака. Сюжэт 1986 года ў бронзе ўвасобіў беларускі скульптар Валерый Кандраценка.**

Кампазіцыя знаходзіцца ў гарадскім скверы, дзе два гады таму быў спачатку ўстаноўлены мемарыяльны гранітны камень. Тады прадпрыемства «Гомельэнерга» абвясціла пра збор сродкаў для стварэння скульптуры. На заклік адгукнуліся больш як два дзясяткі арганізацый і прадпрыемстваў галіны. Свой унёсак зрабілі не толькі энергетыкі Беларусі, але і іх расійскія калегі.

— Трагедыя магла б мець куды большыя маштабы, калі б не самаадданая мужнасць усіх тых, хто з гонарам выканаў свой прафесійны і грамадзянскі абавязак, — адзначыў падчас адкрыцця **міністр энергетыкі Беларусі Уладзімір ПАТУПЧЫК.**

Дарэчы, у ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы бралі ўдзел каля 2,5 тысячы работнікаў беларускай энергасістэмы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Праз 32 гады

**25 красавіка ўпершыню прайшоў брыфінг для дыпламатычнага корпуса, прымеркаваны да гадавіны аварыі на ЧАЭС. На ім яшчэ раз успомнілі пра гэту трагедыю XX стагоддзя, ліквідатараў і жыхароў тэрыторый, якія пацярпелі ад яе. А таксама пра важнасць узаемадапамогі ўсяго свету.**

Чаму менавіта сёлета вырашылі правесці гэты брыфінг, адказаў **намеснік міністра замежных спраў Андрэй ДАПКЮНАС**: «Мы робім гэта з некалькіх прычын. Па-першае, аб'ём і працягласць увагі Беларусі да трагедыі Чарнобыля вызначаецца не толькі ўвагай міжнароднай супольнасці. Яна вызначаецца перыядам паўраспаду радыеактыўных рэчываў, якія забрудзілі тэрыторыю краіны, якія закранулі і змянілі жыццё мільёнаў людзей. Таму нам з гэтым жыць, нам з гэтым змагацца, нам і ствараць сваю будучыню, у тым ліку пацярпелых раёнаў. Мы ўдзячныя міжнародным установам за дапамогу, якая аказваецца».

Акрамя таго, як адзначыў спадар Дапкюнас, у нас ёсць унікальны вопыт у пераадоленні наступстваў аварыі на АЭС і мы абавязаны ім дзяліцца са светам. Яшчэ адзін фактар, які гаворыць пра тое, што гэта тэма дагэтуль актуальная, — непараўнальная хваля чалавечага водгуку на бяду бліжняга, незвычайнае суперажыванне людзей з розных куткоў планеты, якія тады адчулі беларусы. «Мы адчуваем сваю адказнасць, абавязак пра гэта памятаць, за гэта дзякаваць», — растлумачыў намеснік міністра.

На сёння ў краіне налічваецца 71 907 удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Сістэма радыелагічнага кантролю ўключае больш за 800 арганізацый, якія штогод аналізуюць амаль 1,5 млн проб на ўтрыманне цэзію-137. Дакладныя лічбы падаў **намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Генадзь ЛАСУТА**.

У рамках праектаў міжнароднай дапамогі за перыяд з 1990 года на мінімізацыю наступстваў катастрофы на ЧАЭС у Беларусі прыцягнута больш за $84 млн. І гэта лічба не ўключае гуманітарную дапамогу з боку грамадскіх арганізацый і прыватных асоб, а таксама сродкі, патрачаныя донарамі на аздараўленне за мяжой дзяцей, якія пражывалі на пацярпелых тэрыторыях. Намеснік міністра запрасіў дыпламатаў зрабіць выезд на поўдзень краіны і бліжэй пазнаёміцца з пацярпелымі тэрыторыямі ў Брагінскім, Хойніцкім, Нараўлянскім раёнах, а таксама з Палескім дзяржаўным радыяцыйна-экалагічным запаведнікам.

**Надзея АНІСОВІЧ** ■

## БЕЗ БЮРАКРАТЫЗМУ І ПА СПРАВАХ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца ў суботу, 28 красавіка, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. На сувязь з 9.00 да 12.00 выйдуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Васілевіч КРАЎЦОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.